

# Зварот у будучыню

Калектыў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў заклаў у сцяну капсулу з пасланнем студэнтам 2035 года.

“Памяць аб подзвігу не павінна быць аддадзена забыццю” – пад такім дэвізам 30 красавіка прайшла ўрачыстая цырымонія, прысвечаная 80-й гадавіне Вялікай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Мерапрыемства зладзілі ў рамках праекта “Сцяжынамі вайны”, што аб’ядноўвае моладзь Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага інстытута культуры.

